ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
24
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 28 (1478)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
«ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

## НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола універсітэта разгледзела пытанне «Аб ходзе падрыхтоўкі і правядзенні справаздачна-выбарнай кампаніі ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта».

У прынятай пастанове адзначаецца добрая работа па арганізацыі справаздач і выбараў на механіка-матэматычным факультэце (сакратар камітэта камсамола В. Жук), факультэце радыёфізікі і электронікі (сакратар У. Сідаровіч), філалагічным (сакратар І. Крэтовіч), хімічным (сакратар Д. Орлік).

Бюро камітэта камсамола ўказала на слабую падрыхтоўку да справаздачна-выбарнай кампаніі сакратарам камітэтаў камсамола факультэтаў журналістыкі і фізічнага, арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

В. ЮР'ЕЎ.

## АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

прайшоў на факультэце прыкладной матэматыкі. Яго тэма «Алкагалізм і злачыннасць». З лекцыяй выступіў старшы следчы гарадской пракуратуры У. В. Колатаў.

Р. ЛЯХОВІЧ,
загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі.

## ШЧЫРЫМІ АПЛАДЫСМЕНТАМІ

сустракалі працаўнікі сельскай гаспадаркі саўгаса «Чырвонагвардзейскі» Пухавіцкага раёна удзельнікаў культурнай праграмы XII Сусветнага фестывалю моладзі, лаўрэатаў фестывалю Усесаюзнай самадзейнай творчасці танцавальны калектыў «Крыжачок» і А. Ацьмана, якія прыехалі да іх з канцэртам.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

## НА РЭКТАРАЦЕ

заслуханы вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў за тры кварталы 1985 года. Адзначаны недахопы: за 9 месяцаў абаронена 3 доктарскія дысертацыі з 8 запланаваных, 21 кандыдацкая з 80 запланаваных. Не выконваецца план прыёму і выпуску аспірантаў. Адміністрацыйна-гаспадарчымі службамі дрэнна выконваюцца наменклатурныя мерапрыемствы па ахове працы.

Члены рэктарата звярнулі ўвагу ўсіх кіраўнікоў падраздзяленняў і служб на неабходнасць умацавання арганізацыйнай і палітыка-выхаваўчай работы, накіраванай на паспяховае выкананне сацыялістычных абавязацельстваў года і XI пяцігодкі ў цэлым.

Г. МАЦВЕЕЎ,
намеснік старшыні прафкома супрацоўнікаў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# КІРАЎНІЦТВА КАМСАМОЛАМ

ПАДРЫХТОЎКА высокакваліфікаваных спецыялістаў-географаў, фарміраванне ў кожнага студэнта патрэбнасці глыбокага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі, гатоўнасці самаадданa працаваць — галоўныя задачы дэканата, грамадскіх арганізацый факультэта, партбюро.

Штогод партыйнае бюро факультэта сумесна з камітэтам камсамола старанна правозіць вывучэнне і падбор кіруючых кадраў: сакратароў і членаў камітэта камсамола, камсоргаў.

Усе маладыя камуністы працуюць у камсамоле. Праўда, партыйная праслойка ў камсамольскім актыве з кожным годам памяншаецца. Гэта тлумачыцца тым, што вельмі мала камуністаў сярод абітурыентаў.

Рэгулярна на партыйных сходах і пасяджэннях партыйнага бюро факультэта разглядаецца пытанне аб рабоце камсамольскай арганізацыі. Так, у 1984—1985 навучальным годзе чатыры разы абмяркоўваліся справы камітэта камсамола, што датычаць яго работы па паляпшэнню дзейнасці камсамольскіх груп, студсаветаў, студэнцкіх будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадаў. Асабліва цесная сувязь існуе паміж адпаведнымі сектарамі партыйнага бюро і камітэта камсамола, пачынаючы са складання перспектыўнага плана і правядзення канкрэтных мерапрыемстваў.

Пытанні вучобы студэнтаў, іх паспяховасці і наведвання заняткаў пастаянна ў полі зроку дэканата, партыйнай і камсамольскай арганізацый, кафедраў. Пры разглядзе пытанняў вучобы студэнтаў на партыйны сход запрашаецца ўвесь камсамольскі актыў. Партгрупы кафедраў агульнага землязнаўства і глебазнаўства і геалогіі, дзе партгрупоргамі В. А. Барушка і Н. А. Гецэвіч, практыкуюць правядзенне сходаў партгруп сумесна з усімі студэнтамі курыруемага курса. На камсамольскіх сходах звычайна прысутнічаюць выкладчыкі, члены партбюро, дэкан і намеснікі дэкана факультэта.

Камуністы сістэматычна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і правядзенні камсамольскіх сходаў груп, курсаў, факультэта. Дзякуючы дакладнаму кіраўніцтву з боку партыйнай арганізацыі, камітэт камсамола праявіў ініцыятыву, творчы падыход да падрыхтоўкі і правядзення грамадска-палітычнай практыкі. Дакладна распрацаваны адзіная методыка правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі, адзіныя крытэрыі ацэнкі па ўсіх раздзелах асабістага комплекснага плана кожнага камсамольца.

Добра арганізавана работа партыйнай і камсамольскай арганізацый па правядзенню палітыка-выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізацыі адпачынку студэнтаў у інтэрнатах. Камуністы, члены камісіі па рабоце ў інтэрнаце прысутнічаюць на сходах студэнтаў, якія жывуць там. Студэнтам надоўга запомняцца тэматычныя вечары, падрыхтаваныя кафедрамі агульнага землязнаўства, глебазнаўства і геалогіі, фізічнай гэаграфіі мацерыкоў і акіянаў. Неабходна адзначыць і куратара інтэрната № 5 ад факультэта камуніста П. А. Каўрыгу, які шмат увагі ўдзяляе правядзенню розных выхаваўчых мерапрыемстваў, афармленню нагляднай агітацыі.

В. ЯЦУХНА,
сакратар партбюро геаграфічнага факультэта.
В. КАШТАНАЎ,
член партбюро геаграфічнага факультэта.

**Працоўныя Савецкага Саюза! Сустрэнем XXVII з'езд КПСС новымі працоўнымі здзяйсненнямі, высокімі дасягненнямі ва ўсенародным сацыялістычным спаборніцтве! Будзем працаваць ударна, па-стаханаўску!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС.)*

## ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА



*ЗАВЯРШАЕЦЦА другі тыдзень вучэбных заняткаў першага семестра 1985-86 навучальнага года. У час перапынкаў калідоры напаўняюцца гучнай студэнцкай гаворкай. А пасля званка ўсё сціхае. Лекцыі, практычныя, семінары... Ідуць заняткі...*

*НА ЗДЫМКАХ: на V курсе фізфака — патэнтазнаўства; у лабараторыі атамнай фізікі студэнткі III курса фізфака Аксана Белабровік, Святлана Бандалет і Янушкевіч Ірына выконваюць лабараторную работу; Вікторыя Войткун, студэнтка III курса фізфака, адносіцца да вучобы з павагай. У гэтым семестры яна вырашыла палепшыць свае веды ў галіне спецыяльных навук. Сакрэт яе поспеху ў добрасумленнасці.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*







# ДА ВЯРШЫНЬ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СТАЛАСЦІ

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

*ТОЙ ВЫХАДНЫ дзень не быў падобным на ўсе выхадныя дні ва універсітэце. Гучалі камсамольскія песні, аўдыторыі былі ўпрыгожаны лозунгамі і плакатамі, на сталах — букеты кветак. І ва ўсіх прыўзняты настрой. Камсамолія універсітэта здавала свой галоўны экзамен — экзамен на грамадзянскую сталасць. Справаздачна-выбарныя сходы разам з грамадска-палітычнай атэстацыяй праходзілі ў 393 камсамольскіх групах.*





*Давайце і мы спынімся каля аб'явы побач са студэнткамі ФПМ Людмілай Марашчук, камсоргам 10 групы II курса, Ірынай Бараноўскай, адказнай за арганізацыйную работу ў камітэце камсамола факультэта, і Тэрэзай Рутскоўскай, членам камітэта камсамола, адказнай за ГПА. Якую групу лепш наведаць? IV курс, 1 група — адна з лепшых груп факультэта. Гэта невыпадкова. Камсамольцы групы ініцыятыўныя: правялі спартыўны вечар на факультэце; дружныя: групай наведалі ВДНГ; цікаўныя: падрыхтавалі вечар, прысвечаны паэзіі Р. Раждзественскага; працалюбівыя: з 20 чалавек у час працоўнага семестра 15 працавалі ў будатрадзе «Юнацтва», 4 — у сельгасатрадзе «Беларусачка». І ўсё ж хвалюецца Ірына Рамашка, адказная за ідэалагічную работу ў групе. Яшчэ раз перагортвае старонкі асабістага комплекснага плана. Шмат зроблена за год, але ёсць магчымасці зрабіць яшчэ больш. Адказны момант у Марыны Гарачавай. Ідуць выбары новага саставу камсамольскага бюро групы. Ад яго работы ў многім будзе залежыць жыццё групы на працягу года.*



*Сёмую групу II курса ММФ мы наведалі ў той час, калі ішла падрыхтоўка да сходу. Камсамольцы групы разам з камсоргам Святланай Тарасік абмяркоўвалі матэрыялы кастрычніцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС.*

*Сход у другой групе III курса ММФ прайшоў. Але ёсць яшчэ аб чым*









**АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ**

# ТРАФАРЭТНАЯ АСОБА

ЯНЫ ЎСЕ «АКТЫЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ». Члены таварыстваў ДТСААФ, Чырвонага Крыжа, Асвода... І ўзнікні раптам яшчэ якое-небудзь таварыства, яны абавязкова адразу ж сталі б яго членамі. Праўда, у групе, пра якую ідзе размова, работа ў гэтых таварыствах не такая ўжо і вялікая — плата ўзносаў...

— Ці не адбіваецца гэта на матэрыяльным становішчы студэнтаў?— запыталіся мы ў Анжэлы Скраблюковай.

— Ды не, што вы. Я ж яшчэ і член таварыства аховы помнікаў,— з гонарам дадала дзяўчына.— Уношу і тут, так сказаць, свой уклад.

Як, дарэчы, яна гэта робіць і ў сваёй камсамольскай арганізацыі — плаціць узносы. Праўда, у яе асабістым комплексным плане гэта не адзначана. А вось што датычыць таварыстваў, то і ў А. Скраблюковай і яшчэ ў 19 камсамольцаў 5 групы III курса рускага аддзялення філалагічнага факультэта такі пункт асабістых абавязацельстваў у ліку першых. Не, мы ніколькі не хочам прыніжаць ролю грамадскіх фарміраванняў. Але калі яны становяцца выратавальнай саломінкай на грамадска-палітычнай атэстацыі ад нездавальняючай адзнакі, хочацца зрабіць папрок і ў іх адрас.

Так, у той момант, калі яны трымалі справаздачу аб сваёй грамадскай дзейнасці, усе былі актывістамі, членамі, удзельнікамі — словам, людзьмі дзейнымі. І хоць у гэтыя мінуты цяжка было знайсці самага дзелавога чалавека — за гэта не бралася нават Саша Кошкіна (яна скажа, што спісвалі ўсе)— усё ж, безумоўна, такі чалавек быў. Гэта ён браў на сябе такія ні да чаго не абавязваючыя абавязкі. Як, напрыклад, рэгулярна здаваць узносы...

А што было потым? Потым В. Савіцкая, С. Прохараў, І. Раманюк, М. Насюк, астатнія члены групы бралі так званы трафарэт асабістага комплекснага плана і старанна пераводзілі яго радкі ў свой план.

Уся група на працягу года павышала свой ідэйна-палітычны ўзровень праграмнымі дакументамі, без вывучэння якіх наўрад ці можна было б здаць залік або экзамен. Быў у групе і адказны за ідэалагічны сектар С. Прохараў. Гэта ў яго абавязкі ўваходзіла падрыхтоўка палітінфармацый. За год правёў чатыры аглядныя і дзве тэматычныя, хаця і не ведае аб падзеях, якія адбываюцца ў краіне.

А яшчэ яны браліся «павысіць сваю паспяховасць». Згадзіцеся, паняцце вельмі адноснае. І ўсё ж пра вучобу размова асобная.

З аднаго боку — стала менш студэнтаў, якія маюць запазычанасці, з другога — чаму яны ёсць наогул? Магчыма, прычына непаспяховасці — у дрэнным наведванні заняткаў?

Быў час, калі ў аўдыторыі з 24 чалавек займалася ўсяго 9. І ва ўсіх прычыны — часцей за ўсё няўважлівыя. А як гэта звязана з паспяховасцю? Асабістым вопытам можа падзяліцца Кацярына Елісеева. За другі семестр у яе было 210 гадзін пропускаў. Як вынік — да сённяшняга дня не здадзены залік, экзамен, дыялекталагічная практыка. «Елісеева неаднаразова папярэджвалася, звярталіся за дапамогай да куратара»,— скажа ў справаздачным дакладзе камсорг групы Л. Турчанка.

Хочацца спыніць камсорга. Шмат было выкарыстана сродкаў пакарання, але ўсе яны мала дзейсныя. Галоўнае пакаранне студэнтцы вынесла сесія. Куды лепш было б своечасова спыніць такое свавольства. Разабрацца ў яго прычынах і не даводзіць колькасць пропускаў да такой астранамічнай лічбы.

«Мы ж разбіраліся»,— могуць запярэчыць мне. Так, разбіраліся і даведаліся, што Кацярына любіць маляваць. І калі патрэбна было нешта хутка афарміць, звярталіся да яе. Дзяўчына ніколі не адмаўляла. Але, на жаль, заняўшыся справай, яна забывалася пра сваё галоўнае права і абавязак — добра вучыцца. У камітэце камсамола не цікавіліся вучобай студэнткі, у групе не звярталі ўвагі. І не дзіва, што вынік усёй гэтай гісторыі — сумны.

А як быць, калі ты не член бюро групы? Вельмі проста. Пры капіраванні адпаведнае месца патрэбна прапусціць. Вользе Савіцкай неабходна было запісаць: «Абавязуюся ўдзельнічаць ва ўсіх пасяджэннях бюро групы». Вось які абавязак бярэ на сябе адказная за акадэмічны сектар В. Савіцкая. Хіба без такога абавязацельства В. Савіцкая або М. Насюк, адказная за сектар арганізацыйнай работы, не павінны былі не тое што наведваць пасяджэнні бюро групы, але і арганізоўваць яго работу?

А цяпер давайце паразважаем. Што было б, калі б той, першы чалавек, не пісаў такіх агульных фраз і слоў? А падышоў да свайго асабістага плана больш творча? Напрыклад: з групай паглядзець кінафільм «Бераг» і абмеркаваць яго. Было ж гэта ў групе! І яшчэ былі мерапрыемствы. Ірына Піўнева, фізорг групы, выступала з дакладамі: «Роля спорту ў жыцці студэнта», «Рытмічная гімнастыка»; В. Савіцкая арганізоўвала гутарку «Сёння студэнт — заўтра малады спецыяліст». Пад кіраўніцтвам І. Раманюк студэнты групы шэфствуюць над дзіцячым домам...

Толькі як праходзіць гэта работа? Цікава? Напэўна, не скажаш. Вельмі сумна ўспамінаюць пра гэта ў групе. Было, праходзіла... Патрэбна ж за нешта даваць справаздачу. «Зноў жа не хапае жывасці, выдумкі, ініцыятывы. У групе складаецца такая думка, што ўсё павінен рабіць адказны за сектар. Але ж без дапамогі кожнага з нас ніякае, нават самае цікавае мерапрыемства, не адбудзецца». Такое мерка-



*пагаварыць камсоргам: былому І. Татур і Т. Мохаравай, толькі выбранай. Яны разам з членам камітэта камсамола А. Марозка і старастам групы Ж. Захарчэня намячаюць план работы групы.*

*Штаб ГПА дзейнічае. У камітэт камсамола ФПМ у любую мінуту можна было зайсці і атрымаць карысную параду, высветліць невядомыя пытанні, даведацца аб ходзе атэстацыі на факультэце. Патрэбна было толькі звярнуцца да дзяжурных Алены Ляпешка, адказнай за сектар сацыялістычнага спаборніцтва ў камітэце камсамола, і да Людмі-*

*вета універсітэта па ГПП А. В. Шарапа і адказны за сектар ГПП і Ленінскага заліку ад камітэта камсамола універсітэта Ю. І. Юшко.*

*Актыўна і дынамічна прайшла грамадска-палітычная атэстацыя. Далейшае арганізацыйна-палітычнае ўмацаванне ўсіх камсамольскіх звенняў, узмацненне іх мабілізуючай ролі, развіццё ініцыятывы і актыўнасці членаў ВЛКСМ — задачы, пастаўленыя ў Пастанове ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі», паспяхова выконваюцца.*



*лы Панчанка, сакратара камітэта камсамола факультэта.*

*Уважліва слухаюць члены камісіі справаздачу студэнткі 1 групы IV курса факультэта журналістыкі Кацярыны Дубінскай.*

*Задаволены вынікамі атэстацыі старшыня са-*

*Пераважная колькасць добрых і выдатных адзнак, атрыманых камсамольцамі ў час атэстацыі, сведчыць аб гэтым. Кожны год камсамольскага жыцця набліжае іх да вяршынь грамадзянскай сталасці.*

*А. АНАТОЛЬЕВА.*
*Фота А. ВАЛОШЫНА.*

ванне камсорга.

Вось і жыве група па трафарэту. Асабісты комплексны план для ўсіх аднолькавы. Скажа куратар нешта зрабіць — зробяць. Нават сход справаздачна-выбарны — і той трафарэтны. Выйшаў, зрабіў справаздачу, і хай мяне больш не чапаюць. У камітэце камсамола факультэта іх і сапраўды перасталі чапаць. Безнадзейныя, маўляў.

Працавалі з групай, а выніку няма. Але, відаць, становішча, у якім апынулася група, патрабуе больш настойлівых намаганняў. Грамадскую работу вядуць на факультэце І. Скіндар, В. Скіба, Т. Рослава, І. Сас, А. Пугінава... І чаму такая колькасць камсамольскіх актывістаў не можа зацікавіць групу? Група мае калектыўнае даручэнне — шэфства над дзіцячым домам. А як вядома, адносіны да кожнага даручэння такія, як пытаюцца за яго выкананне.

Калі ў групе склалася такая крытычная сітуацыя, то як мага больш увагі павінна ўдзяляцца ёй і з боку партыйнай арганізацыі факультэта. Шкада, што на грамадска-палітычнай атэстацыі не было прадстаўніка партыйнага бюро.

І зноў вернемся да асабістых комплексных планаў. У мэтазгоднасці іх выкарыстання сумнявацца не прыходзіцца. Там, дзе ўлічаны імкненні і патрэбы канкрэтнага чалавека, магчымасці калектыву, там, дзе для іх характэрны комплекснасць, перспектыўнасць, індывідуальнасць,— асабістыя комплексныя планы садзейнічаюць выхаванню. Пры іх складанні неабходна дапамога калектыву, што дасягаецца парадамі з боку актыву або спецыяльна створанай камісіі. Абмеркаванні і зацвярджэнні планаў адбываюцца на камсамольскіх сходах. Магчама, так можна пазбавіцца прынятых у асабістым комплексным плане абавязкаў «здаваць камсамольскія ўзносы». Як перамагчы трафарэтную асобу? Як справіцца з яе раўнадушшам, спакоем? Тут патрэбны агульныя намаганні камсамольцаў групы, куратара, камітэта камсамола, партыйнага бюро.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

КУРСАМ ІНТЭНСІФІКАЦЫІ

# ВЫНІК ТВОРЧАСЦІ

**ЦК КПСС паставіў перад калектывамі вучоных задачу тэрміновага паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Сутнасць праблемы заключаецца ў тым, каб вывесці навуковыя распрацоўкі на самыя сучасныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі і своечасова ўкараняць іх у вытворчасць. Асабліва высокія патрабаванні прад'яўлены да развіцця навукі ў вышэйшых навучальных установах. На неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу вучоных вышэйшай школы, інтэнсіфікацыі іх творчасці ўказвае рэзультатыўная праца вучоных навукова-даследчых калектываў БДУ імя У. І. Леніна. Кожны год эканамічны эфект ад укаранення навуковых распрацовак складае каля 20 мільёнаў рублёў.**

ГЭТЫ ВЫНІК дасягаецца напружанай працай вучоных кафедраў фізікі паўправаднікоў, квантавай электронікі і спектраскапіі, электрафізікі, аналітычнай хіміі. Можна назваць дзесяткі універсітэцкіх навуковых калектываў, якія творча, з вялікім поспехам працуюць на ўзроўні сучасных патрабаванняў.

Кафедра ядзернай фізікі, напрыклад, звязана творчымі сувязямі з многімі навуковымі цэнтрамі краіны. Прылады, створаныя калектывам, праходзяць выпрабаванне на буйных заводах, многія з іх выпускаюцца серыйна. У апошні час група маладых вучоных кафедры пад кіраўніцтвам А. Я. Прахіна на аснове асваення метаду магнітнага рэзанансу па заказу Міністэрства аўтамабільнага транспарту стварыла апарат для рэгуліроўкі расходу паліва аўтамабільнымі рухавікамі. Рэгуліроўка падачы паліва новым прыстасаваннем дае 17 працэнтаў эканоміі. Эканамічны эфект ад укаранення навуковых распрацовак вучоных кафедры ядзернай фізікі кожны год складае не менш як 1,5 мільёна рублёў. Прадстаўнікі кафедры за высокія творчыя дасягненні ў 1984 годзе ўзнагароджаны прэміяй Савета Міністраў СССР.

Прыбліжэнне да вырашэння праблем вытворчасці стала ў апошні час надзённым клопатам вучоных універсітэта. І поспехі ў гэтым напрамку значныя. На кафедры неарганічнай хіміі пад кіраўніцтвам дацэнта Г. Л. Шчукіна створана новая тэхналогія прыгатавання пакрыццяў з алюмінію і яго сплаваў, якая знайшла шырокае прымяненне на вытворчасці.

Працуюць вучоныя універсітэта і над паскарэннем выканання Харчовай праграмы. У Навукова-даследчым інстытуце прыкладных фізічных праблем для прадпрыемстваў Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці, Міністэрства сельскай гаспадаркі распрацаваны метад і створана прылада для вымярэння тлушчу ў малацэ і малочных прадуктах. Навуковая распрацоўка мае вялікае значэнне: дазваляе значна палепшыць умовы і павысіць рэзультатыўнасць працы, якасць малочнай прадукцыі. Ужо створаны і ўкаранёны ў вытворчасць вопытныя ўзоры, якія прайшлі праверку на прадпрыемствах, у тым ліку на Мінскім малочным камбінаце. Прылады, створаныя фізікамі, дазваляюць таксама адмовіцца ад закупак імпартнага абсталявання падобнага тыпу. Іх серыйны выпуск пачне ажыццяўляць Міністэрства мясной і малочнай прамысловасці СССР з пачатку XII пяцігодкі.

Неабходна адзначыць буйныя даследаванні вучоных гуманітарных навук. Толькі ў 1984 годзе выйшлі з друку «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы», «Хрестоматия по истории БССР. 1917—1938 гг.», «Практикум по советскому трудовому праву», кафедрай рускай мовы завершана выданне комплекса вучэбных дапаможнікаў па сучаснай рускай мове з 5-ці частак, падрыхтаванага ў адпаведнасці з рашэннем ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб паляпшэнні выкладання рускай мовы ў нацыянальных рэспубліках. Такое выданне выйшла ў нашай краіне ўпершыню.

Прыведзеныя прыклады высокай рэзультатыўнасці творчай працы вучоных універсітэта не выпадковасць. На кафедрах і ў лабараторыях працуюць моцныя калектывы: на працягу многіх гадоў ішоў працэс адбору найбольш таленавітых вучняў з ліку студэнтаў, якія затым станавіліся аспірантамі, маладымі вучонымі, а цяпер узначальваюць тыя ці іншыя напрамкі навуковых даследаванняў, з'яўляюцца вопытнымі выкладчыкамі і выхавацелямі.

На жаль, такія ўмовы створаны не ў кожным калектыве. Партыйны камітэт дасканала вывучыў сістэму функцыяніравання навуковых фарміраванняў і параўнаў эканамічную рэзультатыўнасць розных лабараторый і кафедраў. Карціна высветлілася цікавая. Асобныя навуковыя падраздзяленні з году ў год не маюць значных вынікаў. Супрацоўнікі гэтых фарміраванняў выступаюць толькі ў ролі выканаўцаў вучэбнага працэсу, але яны не робяць рашаючага ўплыву на фарміраванне творчай асобы студэнтаў.

Тут адкрываюцца значныя рэзервы для павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў і ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу. Партыйны камітэт і рэктарат разам з навукова-даследчай часткай універсітэта ўзялі пад кантроль размеркаванне сродкаў на правядзенне навуковых распрацовак і ўкараненне іх ў вытворчасць. Гэта дае магчымасць канцэнтраваць сродкі на перспектыўных і эфектыўных напрамках развіцця навуковых даследаванняў, хутка апраўдваць матэрыяльныя затраты, пазбегнуць мелкатэм'я і распылення сіл.

На практыцы выяўляюцца факты, калі адна тэма штогод пераходзіць з плана ў план, парушаюцца тэрміны яе завяршэння, ні заказчыкі ні выканаўцы не праяўляюць ініцыятывы хуткага ўкаранення сваіх здабыткаў у вытворчасць.

Цяпер гэта кантралюе навукова-тэхнічны савет, створаны пры рэктарацы. Разам з кіраўніцтвам навукова-даследчай часткі савет рэгулюе вопытнае выкананне распрацовак у канструктарскім бюро, сувязь з заказчыкамі, якія забяспечваюць развіццё вопытных узораў прылад да серыйнай вытворчасці і эксплуатацыі іх на прадпрыемствах.

Савет аналізуе тэрміны праходжання тэматыкі навуковых распрацовак, што спрыяе своечасоваму заканчэнню работ і перадачы іх з лабараторый на прадпрыемствы.

Галоўным у рашучым паскарэнні навуковых даследаванняў з'яўляецца таленавіты вучоны, арганізатар калектыву і выхавацель такіх жа таленавітых вучняў і паслядоўнікаў. Цяпер ужо, безумоўна, адкінута шкодная думка, што ў ВНУ выкладчык можа быць выдатным выхавацелем спецыялістаў без асабістага значнага ўкладу ў развіццё той навукі, якую ён тлумачыць студэнтам.

Вакол вядомых вучоных прафесараў В. С. Сцепіна, А. Ф. Чарняўскага, С. С. Шушкевіча, А. Я. Супруна, В. У. Грузінскага і іншых аб'яднаны маладыя навуковыя сілы, фактычна склаліся спецыялізаваныя школы даследчыкаў, якія нясуць на сабе галоўны цяжар дасягненняў універсітэта. Шматгадовая праца гэтых школ яскрава паказвае таксама эфектыўнасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў на шляху студэнт-аспірант-кандыдат навук. Выпадковасць выбару кандыдатаў у навуку выключаецца дэталёвай праверкай у працэсе працы на кафедры, у лабараторыі, у час выканання грамадскіх даручэнняў.

Настаў час змяніць уяўленне аб аспірантуры. Патрэбна скіроўваць увагу аспірантаў на працэс навуковых даследаванняў, іх рэзультатыўнасць ужо ў час вучобы. Аспірант — гэта даследчык высокай кваліфікацыі, распрацоўваючы новы напрамак у навуцы, выкарыстанне якога ў вытворчасці нельга адкладваць на тры гады, што і здараецца, калі арыентацыя ідзе толькі на дысертацыю.

Безумоўна, што абарона дысертацыі — важная акалічнасць, але яна не павінна быць пачаткам сталай працы вучонага, а толькі этапным паказчыкам навуковага станаўлення, вынікам скарыстанай у вытворчасці навуковай распрацоўкі.

Зараз заканчваецца апошні год пяцігодкі і ідзе працэс фарміравання навуковай тэматыкі на новы год і XII пяцігодку. Для інтэнсіфікацыі даследчай работы — гэта важны этап. Навуковыя калектывы падводзяць вынікі сваёй працы, выканання абавязацельстваў. Паглыблены аналіз дае падставы для заключэння гаспадарчых дагавораў і зацвярджэння новых перспектыўных тэм. Вучоныя універсітэта арыентуюцца на самыя высокія дасягненні ў навуцы, каб сваёй творчай працай унесці найбольш значны ўклад у ажыццяўленне планаў партыі па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу і дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС.

**А. СЛУКА,**
**намеснік сакратара парткома.**

**СВЕТ ВАШЫХ ЗАХАПЛЕННЯЎ**

# СЯБРОЎКА ГІТАРА

**На сцэну выходзіць звычайны хлопец з гітарай са спакойным, прыгожым тварам, жывым поглядам вачэй, добрай, цёплай і шчырай усмешкай. Вось ён паправіў крыху гітару, перабраў пальцамі па струнах, прыжмурыў вочы і — заспяваў. Паплыла прыгожая чароўная мелодыя, загучаў, набіраючы сілу, чысты, спачатку крыху дрыжачы голас. Песня захвалявала слухачоў глыбінёй пачуццяў, шчырай эмацыянальнасцю. Уражаныя, яны доўга апладзіравалі выканаўцу, не хацелі адпускаць яго са сцэны... Гэта выступаў Алесь Камоцкі.**

Не, Алесь не прафесіянальны музыкант або спявак, хоць меў усе падставы лічыцца прафесіяналам. Спачатку ён скончыў музычную школу, потым паступіў вучыцца ў музычнае вучылішча на духавое аддзяленне. Але пасля службы ў арміі ра шыў, як ён сказаў, «кінуць дудзець і заняцца сур'ёзнай мужчынскай справай». Паступіў ва універсітэт на аддзяленне філасофіі. Справа сапраўды сур'ёзная, тут ужо нічога не скажаш. Але вось музыка? Яна, як высветлілася, так і засталася з ім, яна жыла ў яго душы, была ў яго думках і пачуццях. Але не проста музыка, а пэўны гарманічны сімбіёз музыкі і паэзіі.

Гітару Алесь узяў першы раз у рукі гадоў пяць назад. І, як сам прызнаецца цяпер, «грэбаў спачатку па струнах, як курыца лапай». Далей трывалая музычная падрыхтоўка сказала сваё. Хутка Алеся Камоцкага пачалі запрашаць на студэнцкія вечары. Потым здольны хлопец прыцягнуў увагу Маскоўскага райкома камсамола г. Мінска, па запрашэнню якога прыняў удзел у вечарах інтэрнацыянальнай дружбы.

Спачатку ён выконваў папулярныя сярод моладзі шлягеры, але неўзабаве прыйшла да яго і свая песня. Бо з'явілася ўсведамленне, што спяваць абы спяваць — не мае сэнсу. Трэба нешта гаварыць людзям, у нечым пераконваць іх. Першы ўласны твор, які называўся «Сентымент», Алесь напісаў на верш свайго сябра, выпускніка факультэта журналістыкі С. Дубаўца.

Потым знайшоў моцную паэтычную пераканаўчасць у вершах Рыгора Барадуліна і Уладзіміра Караткевіча, Ларысы Геніюш і многіх іншых беларускіх паэтаў. Дарэчы, яшчэ ад бацькі ў дзяцінстве Алесь пераняў любоў да беларускай паэзіі, ад яе ён вучыўся і вучыцца дабрыні і праўдзе, любові да роднай зямлі, у ёй ён знаходзіць адказ на многія вечныя пытанні: хто такі чалавек і дзеля чаго ён жыве на нашай такой неспакойнай цяпер планеце.

І калі гэта паэзія загучала ў яго душы, Алесь адчуў магчымасць дапамагчы іншым людзям адкрыць яе скарбы. Асабліва моладзі. Бо сапраўды ж, не кожны малады чалавек возьме ў рукі паэтычны зборнік. А прыгожая песня пад гітару абавязкова знойдзе больш шырокую аўдыторыю, а мабыць прывабіць і да зборніка.

У сваіх песнях з дапамогай пераканаўчага паэтычнага слова Алесь Камоцкі прымушае задумацца кожнага, ці не госцем ён жыве на гэтай зямлі:

На роднай зямельцы ўсе
мы не госці —
Усе мы чыесьці, усе мы
кагосьці.
І хоць спарахнелі дзядоў
нашых косці
У нашай натуры ёсць
іхняе штосьці.

Гэты ўрывак з песні на верш Ларысы Геніюш вельмі трапна характарызуе сэнс творчасці Камоцкага: паказаць сувязь часоў, сувязь сыноўскага і бацькоўскага лёсу і іх духоўных каштоўнасцей. Ен знайшоў тое, што сёння трэба сказаць людзям, і таму яго слухаюць.

Алесю пашчасціла, калі ў жонцы Кацярыне ён знайшоў аднадумцу і памочніка, і яны склалі бардаўскі дуэт «Каця і Алесь». Пра іх выступленне на свяце «Выстаўка аднаго дня» у Троіцкім прадмесці станоўчы водгук даў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Паспяхова выступілі яны і на міжвузаўскім фестывалі ў Кішынёве: для сваіх паклоннікаў ім прыйшлося спяваць нават у аэрапорце, калі публіка праводзіла іх да самага самалёта.

Хацелася б звярнуць увагу і на тое, што Алесь і сам піша вершы, якіх сабралася ўжо даволі шмат. Але наконт уласнага вершаскладання ў яго свая думка. Алесь разважае так:

— Калі ёсць жаданне пісаць і пішацца, то, я лічу, трэба пісаць. І нават, калі часам не атрымліваецца належным чынам, то ўсё роўна пісаць трэба, толькі не выносіць на публіку, а хаваць ад чужога вока, пакуль не адчуеш, што ўдалося стварыць нешта не вузка ўласнае, інтымнае, а патрэбнае людзям.

У гэтых словах, бадай, яго характар. Ен не прызнае творчасць толькі дзеля творчасці для самазадавальнення.

А на восень Алесь рыхтуе сваю новую праграму. Яму сапраўды ёсць што сказаць людзям, ёсць чым падзяліцца. І, магчыма, імя маладога барда неўзабаве шырэй загучыць у эфіры. Творчасць яго выклікала нямала водгукаў у прэсе. А пакуль мы толькі пажадаем яму далейшых поспехаў у такой патрэбнай людзям справе, як выхаванне словам, якое гучыць.

М. СУПРАНОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ФІЗКУЛЬТУРА · СПОРТ · ФІЗКУЛЬТУРА

# ЧАКАЮЦЬ СЕКЦЫІ СТУДЭНТАЎ

**Напэўна, першакурснік, ты ўжо запісаўся ў адну са спартыўных секцый універсітэта? Так, сумесны сход кіраўнікоў секцый і студэнтаў ужо адбыўся ў актавай зале галоўнага корпуса. Для многіх тых, хто па розных прычынах не змог наведаць гэты сход, ці яшчэ не паспеў падысці да таго ці іншага трэнера, а жадае гэтага, мы і прапануем інтэрв'ю з загадчыкам кафедры фізвыхавання і спорту Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Сяргеем Уладзіміравічам МАКАРЭВІЧАМ.**

**— У якіх спартыўных секцыях змогуць займацца студэнты ў гэтым годзе?**

— Думаю, сёння кожны студэнт універсітэта мае магчымасць займацца любімым відам спорту, было б жаданне. У мінулым годзе 700 чалавек хадзілі на заняткі секцый. Найбольш масавыя з іх — гэта, вядома, ігравыя віды спорту: футбол, хакей з шайбай, валейбол, баскетбол... А ўсяго секцый — 22. Дарэчы, у гэтым годзе ў нас адкрылася новая група — атлетычнай гімнастыкі. Кіруе ёю заслужаны трэнер БССР У. Ф. Кавалёў. Так што запрашаем усіх жадаючых.

**— Якія студэнты могуць займацца спортам ва універсітэце?**

— Усе, хто мае на гэта дазвол ад урача. Зразумела, ёсць размежаванні ўнутры саміх секцый. Напрыклад, члены зборнай каманды універсітэта трэніруюцца часцей — 5—6 разоў у тыдзень, а тыя, хто яшчэ не мае дастатковай спартыўнай падрыхтоўкі,— 2—3 разы. Так што, паўтару, дзверы секцый адкрыты для ўсіх. Кожны год дзесяткі студэнтаў упершыню пачынаюць сур'ёзна займацца тым ці іншым відам спорту. Некаторыя з іх к V курсу з'яўляюцца членамі зборных каманд. Атрымліваюць званні кандыдатаў у майстры спорту. Ужо зараз, напрыклад, мы штогод рыхтуем не менш як 5 майстроў спорту. Але, калі разабрацца, не гэта галоўнае. Галоўнае ў тым, каб як мага больш студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта наведвалі нашы секцыі і былі здаровымі, моцнымі, мужнымі людзьмі. У гэтым сёння мы, работнікі кафедры, бачым свой прафесійны абавязак.

**— Як студэнту сумяшчаць заняткі па фізвыхаванню з трэніроўкамі ў секцыі?**

— А такой праблемы наогул не існуе. Тыя хлопцы і дзяўчаты, якія займаюцца ў той ці іншай секцыі універсітэта, атрымліваюць залік у свайго трэнера. Пасля напісання заявы на імя намесніка дэкана па спартыўнай рабоце з просьбай вызваліць ад заняткаў па фізвыхаванню, якую падпісвае той самы трэнер, студэнт займаецца толькі ў секцыі.

**— Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна часта называюць флагманам ВНУ рэспублікі. Ці можна тое самае сказаць у дачыненні да спорту?**

— Не, так сказаць, на жаль, нельга. Папершае, таму, што ў круглагадовай студэнцкай спартакіядзе мы займаем не першае месца. А па-другое, сярод 33 ВНУ рэспублікі па матэрыяльнай забяспечанасці і колькасці спортзбудаванняў БДУ, як гэта не парадаксальна, займае толькі 27 месца.

Але, нягледзячы на гэта, мы чымсьці можам і пахваліцца. Напрыклад, тым, што ў нас займаецца 47 майстроў і 160 кандыдатаў у майстры спорту і першаразраднікаў. Сярод іх такія вядомыя ў нашай краіне і за мяжой спартсмены, як будучы юрыст, пераможца спаборніцтваў «Дружба-84» барэц Камандар Маджыдаў, будучыя журналісткі, чэмпіёнкі свету па баскетболу і мастацкай гімнастыцы Галіна Савіцкая і Вольга Кісялёва, студэнт юрфака Алег Найдзін — прызёр першынства СССР па водных лыжах...

Яшчэ ў свой актыў запішам і тое, што па выніках мінулагодняй студэнцкай спартакіяды на першых месцах паявіліся нашы зборныя каманды па цяжкай атлетыцы, баскетболу, класічнай барацьбе, шахматах. Другое месца занялі лыжнікі, веласіпедысты, фехтавальшчыкі... Іншымі словамі, ёсць чым ганарыцца універсітэту, але ёсць і над чым сур'ёзна задумацца. Надакучыла чакаць, калі наша кіраўніцтва зверне ўвагу на, мякка кажучы, не вельмі добрае становішча матэрыяльна-тэхнічнай базы спартыўнага гарадка БДУ.

**— Калі закранулі матэрыяльнае забеспячэнне, якія новыя спортзбудаванні ўбачаць студэнты і супрацоўнікі універсітэта ў гэтым годзе?**

— Магу назваць дарожку здароўя, якая ў хуткім часе будзе пабудавана на стадыёне БДУ. Распрацоўваюць і робяць яе ў СКТБ пры БДУ. А ўяўляе сабой гэтая дарожка комплекс трэнажораў для фізічных практыкаванняў.

**— Дзякуй вам, Сяргей Уладзіміравіч, за інфармацыю для нашых першакурснікаў. Спадзяёмся, што на універсітэцкіх спартыўных пляцоўках кожны дзень будзе шмат студэнтаў.**

Інтэрв'ю правёў У. БЕРАЖКОЎ,
наш кар.

# ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ





*РАЗНАСТАЙНЫЯ формы заняткаў па фізічнай культуры прапаноўваюць студэнтам супрацоўнікі кафедры фізвыхавання і спорту. Заняткі праводзяць вопытныя спецыялісты, трэнеры спартыўных секцый. Гэта садзейнічае захапленню студэнтаў спортам.*

*НА ЗДЫМКАХ: заняткі па фізвыхаванню на стадыёне БДУ са студэнтамі фізфака праводзіць выкладчык В. Д. Сідзюк; у зале барацьбы.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

24 кастрычніка 1985 г.
Зак. 3062. АТ 13776.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.